БЮЛЕТЭНЬ

Соймовага Клюбу „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“

№ 2. Вільня, пятніца 4 сьнежня 1925 году. № 2.

ПРАМОВА

дэпутата ВАЛОШЫНА з Соймавага Клюбу Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады на паседжаньні Сойму 25. XI. 25 г. ў часе дыскусыі над Экспозэ Прэмьер-Міністра Скшыньскага. (подлуг стэнаграмы).

Высокая Палата! „Беларуская Сялянска-Работніцкая Грамада“ ня мае да цяперашняга Ураду, Ураду нацыяналістычнай коаліцыі „Хіены“ з лжэ-соцыялістычнаю П. П. С. і „дойлідаўскім“ Пястам—абсалютна ніякіх ілюзіяў.

Коаліцыйный урад п. Скшыньскага зьяўляецца выражэньнем сталага пагоршаньня, як унутранай, так і міжнароднай сытуацыі Польскае Дзяржавы, якая, што раз, то выразьней робіцца комісіянэрам і выканаўцам загадаў заходніх капіталістычных потэнцыяў.

Сам п. граф Скшыньскі зьяўляецца вучнем старой аўстрыйскай дыплёматычнай школы і, ня гледзячы на аслаўлены свой „дэмократызм“ дасканала патрапіць вясьці ў адносінах да ўціснёных Польшчай народаў практыкованую Старою Аустрыяй мэтоду „Divide et impera“. Доказам гэтага зьяўляецца яго палітыка ўцягваньня ў арбіту ураду—буржуазнага Жыдоўскага Клюбу, з якім напярэдадні урад братоў Грабскіх зрабіў гэтак аслаўлены саюз, імкнучыся такім чынам аблягчыць сабе справу ўціску тэрыторыяльных славянскіх гэт. зв. меншасьцяў, якія ніколі з польскаю перамогаю не пагодзяцца.

На загранічным форуме гэты ўрад будзе прадаўжаць вуснамі п. Скшыньскага палітыку аўторэклямы, выслаўленьня польскай „толеранцыі“ і будзе рабіць у Лізе Народаў ніколі не датрыманыя абяцянкі аб школьніцтве з матчынай мовай для беларускага і украінскага народу. Прыпомнім сабе хоцьбы аслаўленую абяцанку п. Скшыньскага ўтварэньня ў Польшчы украінскага унівэрсытэту, зробленую ў мінулым годзе на сэсіі Лігі Народаў у Жэневе.

Гэтай жэнеўскай абяцанцы таварышыла тут — у краі — найцынічнейшае патаптаньне элемэнтарнага права народаў, права ўжываньня роднай мовы. Гэтага права народы — беларускі і украінскі—пад польскаю ўладаю—ня маюць.

І ці маглі-бы мы мець ілюзіі аб тым, што што-небудзь палепшыцца для нас, калі п. Скшыньскі справу асьветы ў сваім габінэце паверыў гэтак заслужанаму ў справе ўціску і дэнацыяналізацыі Беларусаў і Украінцаў. п. Станіславу Грабскаму, галоўнаму ідэолёгу польскага імпэрыялізму, які — не сумляваемся ані на хвілінку— будзе і надалей палітычным рэжысёрам гэтага габінэту.

Пры ясна вызначанай нацыяналістычна-імпэрыялістычнай лініі, прадстаўніком якой зьяўляецца ех-сацыяліст і былы павадыр П. П. С.,—чым, як не дэкарацыяй робіцца ўдзел у гэтым урадзе цяперашніх павадыроў П. П. С., таксама ех-сацыялістаў: Марачэўскага і Земэнцкага.

Уходзячы ў урадавы блёк з Хіена-пястам, П. П. С ці іначай польскія лжэ-сацыялісты, гэтым самым пераняпі лінію польскай рэакцыі ў адносінах да нацыянальнасьцяў, паняволеных Польшчай. Прызнацца ўрэшце трэба, што і перад гэтым ніколі П. П. С-ы ад гэтай лініі ня былі вельмі далёкімі. Бо эндэкі кіраваліся засадамі яўна грабежна-заборчымі, а П. П. С. маскавала свой заборчы апэтыт у адносінах да нашых зямель фэдэральным зваротам. А фактычна П. П. С. была варта. Н. Д. і наадварот. Варты Пац палаца і палац Паца. Доказам гэтага—хоць-бы прапазыцыя пасла Марыяна Малінаўскага і 31 пасла з П. П. С., паданая 10 траўня 1921 году ў Устаўадаўчым яшчэ Сойме, дзе гэтыя паны дамагаюцца распачацьця безадкладнай колёнізацыі гэт. зв. „Усходніх Крэсаў“. Доказам гэтага—крывадушная нібы прыязная дзейнасьць П. П. С. у адносінах да беларускага і украінскага народу, з якіх П. П. С. хоча зрабіць „форпошты“ процi Саюзу Сацыялістычных Радавых Рэспублік, міма таго, што іменна там, у рамах гэтага Саюзу, нашыя народы маюць поўную свабоду і твораць уласныя радавыя рэспублікі—беларускую і украінскую.

Ня гледзячы, значыць, на ўдзел у ўрадзе П. П. С.,—ня маем ніякога сумліву аб тым, што ўва ўсіх напрамках, а пераважна ў гэтак важнай галіне, як асьвета, трываць будзе з поўным спакоем ранейшая палітыка, ідучая на лініі вынішчэньня, дэнацыяналізацыі і ашуканчай полёнізацыі. Бо не магчыма іначай назваць гэтай сыстэмы, якая запанавала на гэт. зв. „Усходніх Крэсах“, ці іначай на землях Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны, знаходзячыхся пад Польшчай,—як сыстэмай ашуканскай полёнізацыі. Бо калі гучна ўхваляюцца языковыя законы для гэт. зв. меншасьцяў, рэклямуюцца яны на загранічным форуме, як „доказ ніколі ня гаснуўшай польскай толеранцыі“ і г. д., і г. д., — а адначасна замыкаюцца літэральна ўсе беларускія школы,—у ліку шасьцідзесяці сямі, — то гэта ёсьць крывавае ашуканства і насьмешка, разлічаныя на наіўнасьць і легкавернасьць беларускага народу і заходняй думкі.

Польская Буржуазія і польскі ўрад ня меў адвагі вясьці сваю полёнізацыйную палітыку адкрыта, і таму ўхвалілі тут, у Сойме, аслаўленыя ліпенёвыя ўставы і пад іх прыкрыцьцём прадаўжаюць сваю нялюдзкую работу.

Сьцьвярджаем, што — на падставе тых ашуканскіх уставаў, ані адна беларуская школа ня была адчынена, хоць беларуская люднасьць, сярод вельмі няспрыяючых абставінаў паміма ўсялякай контр-агітацыі і тэрору адміністрацыйнае ўлады і польскіх нацыяналістаў—злажыла ў працягу $1\frac{1}{2}$ мес. 15.000 дэкляpацыяў на 412 пачаткавых школ! 19 дзяржаўных беларускіх школ зачынена, замяняючы іх утраквістычнымі.

Моладзі, што кончыла беларускія гімназіі, не прызнаюцца правы матурыстаў. Параграф вайсковага ўставу, прызнаючы права да адсрочкі службы ў войску для вучашчайся моладзі, у адносінах да беларусаў не прызнаецца: беларусаў— васьмікласьнікаў забіраюць з школьнае лавы; пакуюць на два гады ў полк далёка ад роднае староньі, загубляючы яму такім чынам навуку і ломячы яму гэтым жыццё.

Польская буржуазія вельмі любіць паклікавацца на вэрсальскі трактат і ўпіраецца, што няўхільна стаіць на яго груньце; не перашкаджае, аднак, ёй гэта паступаць насупроць гэтаму трактату,—там, дзе хочуць пагвалціць нацыянальныя правы беларусаў і украінцаў. Гэтак сама прадстаўляецца справа з Констытуцыяй і іншымі гэт. зв. уставамі аб вольнасьці.

І вось, насупроць усім гэтым пекным актам, забавязаньням і абяцанкам—п. Ст. Грабскі, ідэолёг вэрсальскай польскай буржуазіі, увёў абавязкавае вучэньне польскае мовы, гісторыі Польшчы, гэографіі Польшчы, вучэньня аб сучаснай Польшчы, і дамагаецца пад пагрозай зачыненьня нашых гімназіяў выкладаньня агульнае гісторыі і агульнае географіі папольску.

Ужо цэлы год ляжыць у Міністэрстве статут Т-ва Беларускае Школы, якога не зацьвярджаюць, каб унемагчыміць разьвіцьцё прыватнага беларускага школьніцтва.

Па насьледзтву ад ураду Грабскага цяперашні Урад Хіена-Пястоўска-Пэпэсаўскай Коаліцыі дастаў яшчэ іншага міністра, а іменна „Крэсовага“ міністра унутраных спраў,—п. Рачкевіча. Хіба ніколі — нават за часоў Ратайскага, хваля рэпрэсіяў і правакацыі, белага тэрору і зьдзекаў—бічаваньняў не дасягала гэтакай вышыні на землях Заходняе Беларусі, як у часе ўрадаваньня гэтага міністра.

Концэнтрацыйныя абозы для палітычных вязьняў у Беластоку, Бельску, Ляндварове і Маладзечыне і трагічныя зьявішчы зьдзекаў, біцьця пры дапросе і мук, робленых тым людзям у часе „badania“ іх палітычнымі вырадкамі —дэгэнэратамі —ўсё гэта пераходзіць ужо ўсялякую людзкую меру і выклікае новыя галасы пратэсту заграніцай. У апошніх часох дайшоў да нас, напрыклад, палымянны пратэст бэльгійскіх вольнадумных арганізацыяў, выражаючы свае абурэньне з прычыны расшырыўшагася пераважна ў Заходняй Беларусі польскага тэрору.

У Заходняй Беларусі той толькі можа не арыштоўвaецца, хто нічога ня чытае і нідзе нічога не гаворыць. А тыя, што сьмеюць чытаць беларускія газэты, або публічна гутарыць пабеларуску, тыя ня пэўны за сваю асабістую вольнасьць, нават жыцьцё. Чалавека, усаджанага ў вастрог, калі нават і не закатуюць на сьмерць, то заморaць голадам. Бо-ж знаны, што—раз, тосьцейшыя факты адмовы ў прыняцьні ежы, якую радня прыносіць вьязням.

У гэтай галіне—наперад пераконаны мы,—што ўсё пойдзе пастарому, — выробленым шляхам. Гвалты і рэпрэсіі будуць прадаўжацца і патураць ім будзе п. Рачкевіч, апіраючыся на Хіена-Пяста і П. П. С., якія сілаю рэчы возьмуць на сябе за ўсе гэтае адказнасьць!

А чаго можам спадзявацца ад новага міністра вастрожніцтва—хрысьціянскага дэмакрата п. Пехоўскага?

Ці можам спадзявацца, што п. Пехоўскі будзе кіравацца ў сваей дзейнасьці хоць найскрамнейшымі, найэлемэнтарнейшымі засадамі хрысьціянізму ці дэмократыі? Ці захоча падбаць гэты хрысьціянскі дэмакрат аб тым, каб у падлягаючых яму 345 вастрогах Польскае Рэпублікі—абавязвала галоўная запаведзь хрысьціянізму: не забі, або хоць не катуй, ня зьдзекуйся; а ў судах найэлемэнтарнейшыя вымаганьні дэмократыі: не садзі на 4 гады ў катаргу за шчырае слово сялян ці работнікаў.

Не сумляваемся, што не! І ведаем, што іменна ўгрупаваньне п. Бехоўскага вяло найзаядлейшае ганеньне на вязьняў—змагароў за сялянска-работніцкую справу.

Таксама ў галіне зямельных справаў і рэформаў ня можам спадзявацца *ніякіх* перамен ранейшай палітыкі калёнізаваньня нашых зямель, дзе люднасьць цярпіць страшэнны зямельны голад і агульны недастатак; а сотні асаднікаў — Мурашкаў з цэнтру Польшчы атрымоўваюць багатыя надзелы. З якога элемэнту бяруцца гэтыя асаднікі, як вайсковыя, так і цывільныя, аб тым добра ведае спакойная беларуская люднасьць, якая на кожным шагу адчувае на сабе іх праступную ролю. Не далей, як некалькі дзён таму назад—15 лістапада—ў в. Максімаўка, Радашкаўскае гм. Вялейскага пав.—адзін з гэтакіх паноў забіў некалькі беларусаў пры помачы ручной гранаты. Цяперашні Урад і далей будзе вясьці сваю зямельнух палітыку пад дэвізам: „Зямля для багатыроў і вайск[illegible] асаднікаў“ — а беларускага і украінскага селяніна, таксама, як і беднага селяніна польскага будзе душыць падаткамі і ашуківаць мыльнымі пузырамі аб зямельнай рэформе.

А ў найважнейшай галіне, у галіне падаткаў —ці магчымы якія-небудзь фактычныя перамены? Ці цяперашні ўрад прадставіць і ці здольны ён прадставіць якую-колечы праграму паправы? Адказ зноў ад'емны. Паводле праграмы, якую высоўвае найпаважнейшая урадавая група — гэт. ёсьць Н. Д., якая заняла скарб, урад дамагацца будзе ад Сойму *новых далека ідучых паўнамоцтваў, каб не кіравацца істнуючымі уставамі;* далей, урад мае паводле гэтай праграмы ўзяць загранічную пазыку—пад залог дзяржаўных манаполяў. Адным словам Урад Хіена-Пяста-П. П. С-аў будзе прадаўжаць тое, што было найгоршым і найбрутальнейшым—капіталістычным у пачынах ураду Грабскага, ураду згубы Польшчы і ўсіх людзей працы.

Так, значыць—незалежна ад дэкорацыйнага удзелу ў урадзе двох П. П. С-аў—урад гэты будзе вясьці капіталістычную палітыку, палітыку далейшага абцяжваньня селяніна і рабочага падаткамі — пасярэднімі і манаполямі, якія забярэ ў арэнду—залог і прадаваць усёмагутнаму сёньня загранічнаму капіталу.

А сяляне, работнікі і працоўныя інтэлігэнты— ўсіх нацыянальнасьцяў, пражываючых ў Польшчы— і далей будуць сьпіхацца ў пропасьць гаспадарчага развалу на дно магчымага пражыцьця, на дно паніжэньня.

Адзінаю магчымаю дарогаю выхаду з гэтага палажэньня, адзінаю дарогаю, вядучаю да вызваленьня, як працоўных масаў у Польшчы, так і народаў паняволеных Польшчаю—ёсьць упорная барацьба з урадам буржуазіі і яе памоцнікаў— барацьба за работніцка-сялянскую ўладу.

Толькі гэтакі ўрад можа вывясьці Польшчу з багна крызісу і паніжэньня, ён-жа адчыніць дарогу да вольнасьці для беларускага і украінскага народу.

З Урадам Хіена-Пяста-П. П. С. будзем змагацца і разам з пралетарыятам усяе Польшчы змагацца будзем за уладу сялян і работнікаў, за сацыяльную і нацыянальную свабоду для заходняй Беларусі і Украіны.

Будзем галасаваць процi Ураду.

ІНТЭРПЭЛЯЦЫЯ № 6

паслоў Клюбу Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады да пана Міністра ўнутраных спраў—у справе беспадстаўнай і бяспраўнай канфіскацыі №№ 14 і 15 газэты „Жыцьцё Беларуса“.

Падрад 2 нумары выходзячай у м. Вільні беларускай газэты „Жыцьцё Беларуса“ ізноў падпалі чарговай канфіскаце па загаду Камісара Ураду на м. Вільню п. Вімбора.

Гэты апошні падвойны акт рэпрэсіі над многа-пакутнай беларускай газэтай зьяуляецца асабліва выдатным дайшоўшым да апошніх рубяжоў адміністрацыйнай самаволі і бяспрыкладнага надужыцьця ўлады.

№14 газэты „Жыцьцё Беларуса“ сканфіскаваны за 3 артыкулы. Першы арт. пад загалаўкам „Новы замах на Базыльянскія муры“ зусім спакойна й аб'ектыўна падаў грамадзянству дакладную інфармацыю аб тым, што адбылося 22.X. у былом памешканьні Беларускай пачаткавай школы ў Вільні, якое памешканньe—было занята на точнай падставе істнуючых у Польшчы законаў уласьнікам і валадаром усяга гмаху муроў і праўным арандатаром яго часткі—мясцовай уладай Праваслаўнай Царквы і аднэй з беларускіх дабрадзейна-культурных установаў.

Артыкул спакойна паінфармаваў грамадзянства аб тым, як у гэтае памешканьне зьявіўся атрад паліцыі і згодна з атрыманым загадам тагож Камісара ўраду гвалтам выкінуў вучняў Правасл. Сэмінарыі і дзяцей з Белар. Прытулку Тав. Помачы Ахварам Вайны.

Да артыкулу былі прыложаны 2 телеграмы, высл. Старшыней Камітэту Белар. Т-ва Помачы Ахвярам Вайны п. Астроўскім да п. міністра справядлівасьці, з копіямі пану міністру ўнутр. спраў і паслу Тарашкевічу і п. Рэктарам Віленскай Прав. Сэмінарыі япіскапам Антоніем да Вар. шаўскага Праваслаўнага Сыноду, з копіямі п. мін. Рэлігіяў і Публічнай і Асьветы і ўнутраных спраў.

Вось даслоўны пераклад гэтага артыкулу і тэлэграмаў:

Новы замах на Базыльянскія муры.

22/X ў 7 гадз. раніцы, калі мелі пераносіцца ў новае памяшчэньне беларуская пачатковая школа № 33, якая займала дагэтуль памяшчэньне беларускага прытулку К-ту Помачы ахвярам вайны ў Св. Траецкіх мурох,—зьявіўся вядомы п. Студніцкі ў асыстэнцыі паліцыі з мэтаю захапіць гвалтам гэтае памяшчэньне пад архіў.

Прыймаючы пад увагу, што куратар Віленскага школьнага вокругу пісьмом сваім пад нум. 21021 зьвярнуўся да япіскапа Антонія, як *гаспадара гэтага будынку,* з просьбаю заняць гэтае памяшчэньне дзеля праваслаўнае духоўнае сэмінарыі, —гэты апошні ў паразуменьні з старшынею Беларускага К-ту Помачы ахвярам вайны гр. Астроўскім, да якога, згодна з кантрактам, памяшчэньне гэнае належыць да 16/VIII 1926 году, і заняў звольненае школаю памяшчэньне, пераносячы туды інтэрнат.

Не зважаючы на пратэст Старшыні К-ту, а таксама япіскапа Антонія, які зараз-жа паехаў у гэтай справе да Дэлегата Ураду,—паліцыя на падставе загаду Камісара Ураду п. Вімбора *гвалтам выкінула усе рэчы,* выносячы ложкі разам з ляжаўшымі на іх сэмінарыстамі. Сэмінарыстаў, якія не

хацелі добравольна пакінуць сваё памяшчэньне, і асоб з інспэкцыі сэмінарыі *паліцыя сілком выпіхала* на калідор.

Апэтыт п. Студніцкага гэтак разгарэўся, што ён рашыў „пад шумок“ захапіць і тое памяшчэньне, якое ад 6 гадоў да апошняй хвіліны займаў беларускі прытулак і толькі ад 8 да 2 гадзіны папал. дазваляў карыстацца ім для патрэбаў беларускае пачатковае школы. Па загаду адміністрацыйнае ўлады былі *выкінуты з гэтага памяшчэньня усе дзеці, кіраўніцтва прытулку і нават нятыкальны сэнатар Багдановіч*, які, будучы дыжурным у гэты дзень, прышоў выканаць свой грамадзкі абавязак. Дзеці змушаны былі разлёкавацца *у холодным калідоры*, бо памяшчэньне апячатана, і пастаўлены два паліцыянты.

Падчас усяе гэтае працэдуры не абышлося бяз эксцэсаў, бо *старшы* „przodownik“ № 306, хочучы, відаць, выслужыцца перад п Студніцкім, *кінуўся на вучняў сэмінарыі з кулакамі, выцягнуўшы двоіх сэмінарыстаў*.

Толькі ўмяшацельства сэнатара Багдановіча і Старшыні К-ту гр. Астроўскага, ды тактоўнасьць кіраўніка III кам. паліцыі *не дапусьціла да крывавых сутычак*, бо старэйшыя вучні, як сэмінарыі, так і гімназіі, былі так абураны грубым гвалтам і бяспраўем, што найменшая іскра магла-б быць прычынай вялікага пажару... Сярод натоўпу вучняў чулася абурэньне і, каб ня ўстрымліваючы ўплыў школьнае адміністрацыі, справа магла атрымаць вельмі прыкры ход.

Аб гэтым пасланы дэпэшы мін. Справядлівасьці, Унутр. Спраў і паслам Сойму, у той-жа дзень сэн. Багдановіч і пас. Рак-Міхайлоўскі выехалі ў гэтай-жа справе ў Варшаву.

Тэксты тэлеграмаў:

Міністру Справядлівасьці
ў Варшаве.
Копія Міністру Унутраных Спраў. Копія дэпутату Тарашкевічу, Сойм.

22-га кастрычніка Дырэкцыя Публічных Работ у Вільні пры ўчасьці паліцыі прымусам выкінула з памяшчэньня Беларускага Прытулку, Вострабрамская 9, дзяцей, адміністрацыю і ўсе рэчы з мэтай аддачы сказанага памяшчэньня кіраўніку Архіву Студніцкаму. Выпаўняючы абавязкі дыжурнага сябра Беларускага Т-ва помачы ахвярам вайны сэнатар Багдановіч также быў выдалены прымусам. Памяшчэньне запячатана. Дзеці месьцяцца на сьцюдзёным калідоры.

Пратэстуючы проці пагвалчаньня права адміністрацыйнай уладай, зварачаюся да пана міністра з просьбай даць загад, каб ураз было вернена паруханае ўладаньне.

(—) *Р. Астроўскі.*
Старшыня Камітэту Бел. Т-ва пом. ахв. вайны.

Сынод Праваслаўнае Царквы Зыгмунтоўская 13
Варшава—Прага
Копіі: Міністру Рэлігійных Вызнаньняў, Міністру Унутраныў Спраў.

Выпаўняючы даручаньне Куратара Віленскага Школьнага Бокругу № 21021, я загадаў заняць на патрэбы сэмінарыі звольненае беларускай школай памяшчэньне ў гмаху сэмінарыі пры Вострабрамскай вул. № 9. Зьмешчаная мною ў сказаным памяшчэньні часць інтэрнату сэмінарыі сягоньня сілай выкінута паліцыяй панствовай з ужыцьцём гвалту над асобамі вучняў і інпспэкцыі сэмінарыі. Памяшчэньне запячатана, пастаўлена паліцэйская варта.

Ня гледзячы на маю просьбу прыпыніць гэты акт да паразуменьня з цэнтральнай уладай, паліцыя ў часе маей інтэрвэнцыі ў Делегата Ураду ўчыніла сказанае пагвалчэньне права

Паведамляючы аб вышэйшым, прашу Сынод Праваслаўнае Царквы аб інтэрвэнцыю ў рашаючых чыньнікаў Ураду і аб прысылку загаду аб аддачы ўраз-жа сказанага памяшчэньня законнаму ўласьніку яго—Праваслаўнай Царкве—дзеля патрэб сэмінарыі.

(—) *Антоній,*
Япіскап, Рэктар Сэмінарыі.

Скрыць гэты факт, выклікаўшы вялікае абурэньне ў беларускім грамадзянстве, яго прэсавы орган ня меў права тым больш, што па месьце цыркулявалі самыя фантастычныя і хвалючыя весткі, асабліва пасьля нядаўнага вынаходу ў тых-жа Мурох „дынаміту“.. а ўся мястовая прэса падала аб здарэньні абураючыя, нязгодныя з праўдай і яўна іньспіраваныя п. Студніцкім інфармацыі.

Другі з канфіскаваных артыкулаў „Хто мы такія“ (Голас беларускага настаўніка) не зьмяшчае ў сабе ані воднага рэзкага слова, зьвяртаецца да беларускіх сялян, каб яны добра ведалі, што яны —беларусы, і дамагаліся, па праву, сваей роднай школы. Вось гэты артыкул:

Хто мы такія?

(Голас беларускага настаўніка).

Калі на жыда нападуць нат' бандыты і пад пагрозай сьмерці спытаюцца ў яго, „хто ты такі? — ён адразу скажа, не баючыся сьмерці: „жыд“. Калі-ж які паліцыянт, або так які паўпанак, спаткаўшыся з вясковым інтэлігентам—праваслаўным беларусам, так сабе ў гугарцы спытаецца ў яго: „хто ён такі“?—дык адказ будзець або: „рускі“, або: „ня ведаю“, або іншы раз нат „паляк“.

Гэтак адкажаць вясковы праваслаўны інтэлігентны беларус. Наадварот: вясковы селянін, якога мала зачапіла расейская культура, адразу і проста скажа: „я беларус, а што табе ад мяне трэба?“.

Чаму інтэлігент адкажа ня так, як селянін? Чаму інтэлігент нібы ня ведаець, хто ён такі?

Таму, што ў душы інтэлігента на школьных лавах вытраўлялася яго нацыянальнае пачуцьцё. Замест нацыянальнага пачуцьця ў душы беларускага дзіцяці разьвіваліся інстынкты панаваньня інтэлігента над цёмным сваім братам селянінам; разьвівалася жаданьне мець пастаянны кавалак белага хлеба замест чорнага хлеба з падмешкаю бульбы; мець мяккую пярыну пад бокам замест куля простай саломы, або вязкі гарошынаў; сядзець на кресьле замест лавы і г. д. Была так пастаўлена навука, што дзіця, выйшаўшы з сярэдняй школы, забывалася і аб чорным хлебе з бульбаю, які яно ела разам з бацькам, і аб кулі саломы, або вязцы гарошынаў, на якой валялася з братамі і сёстрамі, і аб тапчане, на якім яно вучылася першыя склады па лемантарыку. Даходзіла іншы раз і датаго, што гэнае-ж самае дзіця нат' цуралася свайго роднага бацкі ў сярмязе, або маткі ў хадакох, — ня кажучы ўжо аб тым, каб любіла сваю родную беларускую песьню, якой у школе колькі гадоў ня чула. Такое дзіця і ўстыдалася загадаць у школе ў сваёй роднай мове загадку, якую яно чула ад маткі і стыдалася прыказак, жартаў у беларускай мове. А аб вопратцы роднай і гаварыць ня прыходзілася! І так, як „падцягвалі“ беларускае дзіця расейцы, хочучы нібы зрабіць з „мужыка“—„гаспадзіна“—гэтаксама цяпер яго „цягнуць“ палякі, маючыся вытравіц з яго „мужыцкае“ і звабіць „панам“..

Але хто-ж мы такія? Ці думаў калі аб гэным стары або сярэдніх гадоў інтэлігент з вёскі беларускай?

Мусіц, анно той думаець, які дагэтуль сядзіць бяз службы і без інтэлігенцкіх выгодаў. І, мусіц, таму, што гэны народны інтэлігент ірачнуўся ад сну, апамятаўся і моцна стаў на родны грунт,—таму ён і сядзіць цяпер галодны. Таму ён цяпер і ня маець ні службы, ні белага хлеба, ні пярыны пад боком, ні крэсла, а змушаны есьці або хлеб з бульбаю, або бульбу бяз хлеба, спаць на гарошынах, або проста і сядзець, і спаць на лаве, ці тапчане.

Але гэтакіх мала. Іх вельмі нязначная частка. А ці думаець тая вясковая беларуская інтэлігенця, якая маець і белы хлеб, і пярыну, і камашы, і табурэтку: „хто-ж мы такія“? Ці думаў вучыцель Грынько ў Рахавічах, Слонімскага пав., „хто ён такі“, сьпяваючы на кожных хрысьцінах або вясельлі ў сваёй роднай вёсцы: Jeszcze Polska nie zginęła, kiedy my żyjemy?“... Ці падумаў вучыцель Самасюк, „хто ён такі, страшучы арыштам бацькоў у вёсцы Талькаўшчына, Слонімскага пав., якія хацелі ў свой час злажыць дэклярацыі на родную беларускую школу? Ці думаў вучыцель Барвіюк (Ваўкавыскага пав., вёска Нябодзічы), „хто ён такі“, б'ючы дзяцей да крыві, вучачы іх у польскай школе літэры „ą ę“, якіх дзеткі вымавіць не маглі?!.. Яны аб гэным напэўна ня думалі, „хто яны такія“.

А колькі такіх Грынькоў, Самасюкоў да Барвіюкоў ёсьць? Калі толькі ім давялося пакаштаваць крошкі, якія падаюць з „панскага“ (замест „гаспадарскага“) стала, дык адразу ад галавы іх адскочылі і бульба бяз хлеба, і гарошыны, і лава з тапчаном. Кія ў рукі ўзяў, ужо і капрал!

Селянін вясковы! Ты ведаеш, хто ты! Ратуй свіах дзяцей. Не рабі ты з сваіх дзяцей катаў на свой карк. Узгадоўвай дзетак у сваёй роднай матчынай мове. Пасылай у родныя школы. Ня бойся вастрогу за родную школу. Не шкадуй апошняга граша на родную навуку.

Што нам з таго, што культура Немцаў ці Ангельцаў высокая? Трэба сваю культуру і навуку падыймаць. Бяры прыклад з Ангельцаў: яны ляпей будуць мяўкаць або гаўкаць на роднай мове, чым гаварыць іншаю моваю. Што нам з багатага культурнага двара панскага, калі ён панскі, а ня наш?.

Ратуйма свае малое. Давайма сваім дзеткам усё роднае, — тагды дзіця тваё навучыцца шанаваць і мазоль бацькі, і сярмягу, і словам вучоным і родным з бацькамі ці знаёмым падзяліцца не паўстыдаецца, і тагды дасьць адказ на пытаньне: „Хто-ж мы такія?“.

Трыпісьцьнік.

Трэці „преступны“ артыкул—кароткая хронікёрская заметка аб толькі што выкананым школьнай уладай пераносе адзінай астаўшайся ў м. Вільні беларускай пачаткавай школы з цэнтру места (з тых-жа Базыльянскіх Мyроў...)—на самы яго край — за праваслаўныя могілкі, дзе гэтая апошняя школа павінна будзе бясспрэчна захірэць і кончыць свае жыцьцё—дзеля свае вялікае адлежнасьці ад места. Гэтая бязвінная нататкa гласіла так:

Прысуд сьмерці апошняй беларускай школе.

Сьмяротны прысуд улады апошняй беларускай пачаткавай школе ў Вільні, якую з гэтай мэтай перакідаюць з Базыльянскіх муроў за некалькі кілямэтраў на край места (за праваслаўныя магілкі!), споўнены ў чацьвер, 22 кастрычніка... Школа выкінута ў такую глуш, куды дзеці з даўнейшага рейёну бязумоўна ня здолеюць хадзіць, — і вось сьмерць школы забясьпечана!

Так распачалася ўрадаваньне новага віленскага куратара, які перад францускімі гасьцьмі-парлямантарыямі так многа гаварыў аб „узвышаным польскім ідэалізьме і толеранцыі Польшчы“, прыкладам чаго зьяўляецца істнаваньне ў Вільні школ жыдоўскіх, расейскіх, беларускіх і літоўскіх.. У істнаваньні Беларускае Гімназіі ў Вільні ў кожным выпадку *Польшча напэўна не вінавата*, наадварот, Гімназія істнуе насупраць усім патугам улады зьліквідаваць яе, істнуе дзякуючы ахвярнасьці беларускага вучыцельства. якое за сваю цяжкую працу атрымлівае пріблізна гэтулькі, сколькі... дворнік у віленскай камяніцы!

Наступны № 15 газэты быў, як другі наклад, зроблены вельмі аглядна: Усе сканфіскаваныя артыкулы былі выкінуты, пакінуты ўвесь не сканфіскаваны матэрыял, дапоўнены бягучай інфармацыяй. У спр[illegible] здарэньня ў Базыльянскіх Мурох пакінуты толькі абедзьве тэлеграмы Старшыні Белар. Каміт. помачы пацяр. ад вайны, п. Астроўскага і рэктара Прав. Дух. Сэмін. у Вільні Япіскапа Антонія з скаргамі на надужыцьці мястовай адміністрацыі да яе найвышэйшых уладаў рэспублікі.

Телеграмы гэтыя, як прынятыя на Дзяржаўнай Пошце, зьяўляючыяся афіцыальным дакумэнтам у справе, рэдактар газэты ня меў падставаў лічыць праступнымі.

Калі-б гэтыя тэлеграмы зьмяшчалі нешта праступае, дык яны не маглі быць прыняты на пошце, і ў-ва ўсякім выпадку іх аўтары павінны былі-б быць прыцягнуты да адказнасьці іх высокімі адрэсатамі, панамі міністрамі цэнтральнага Ураду Рэспублікі. З другога боку, канфіската ў газэце гэтых тэлеграмаў праз тую самую мястовую адміністрацыю, на паступаньне якой пасланы вышэйшым уладам матываваныя скаргі, зьяўляецца бяссумлiўным і бяспрыкладным надужыцьцем мястовай адміністрацыйнай улады.

Да усяго гэтага трэба дадаць, што тыя-ж самыя тэлеграмы былі зьмешчаны ў атрыманым ў Вільні яшчэ да выхаду канфіскаванага № 15 беларускай газэты ў нумары варшаўскай расейскай газэты „За Свабоду“ і ўжо пасьля дня канфіскаты ў варшаўскай польскай газэце „Роботнік“. Абедзьве варшаўскія газэты ані ў Варшаве, ані ў Вільні сканфіскаваны за гэта, зразумела, ня былі!

Апрача гэтых тэлеграмаў, п. Камісар Ураду ўказаў яшчэ адзін крымінальны артыкул № 15 газэты, „Апэляцыя украінцаў да сусьветнай апініі наступнага зьместу“:

Учасьнікі кангрэсу нацыянальных меншасьцяў у Жэнэве украінскія паслы і сэнатары зрабілі прадстаўніку швайцарскага тэлегр. агенцтва гэткую заяву:

Як і ў мінулыя гады, і сёлета польскія ўлады зрабілі масовыя арышты сярод украінцаў, асабліва на Валыні і ў Палесьсі. Арыштоўваецца пераважна ўкраінская інтэлігенцыя. Крывадушным апраўданьнем гэтых арыштаў улады выстаўляюць рэвалюцыйны камуністычны рух, які імкнецца да адарваньня ўкраінскай тэрыторыі ад Польшчы і злучэньня з Радамі. Дык вось прадстаўнікі украінскага народу ў Польшчы сцьвярджаюць перад усім сьветам, што пад прыкрыцьцем гэтых закідаў польскі ўрад узапраўднасьці вядзе барацьбу не з камуністычным рухам, але з украінскім народам. Проці 7-мі мільённага украінскага народу тасуецца пляновая сыстэма гвалтаў, пазбаўляючая яго эламэнтарных нацыянальных правоў. Шмат пачаткавых школаў зачынены ці перароблены на польскія, ня гледзячы на новы закон, які загадвае адчыненьне новых. Украінскі унівэрсытэт і палітэхнікум у Львове істнуюць падпольна. На украінскай зямлі насаджаны дзесяткі тысяч польскіх асаднікаў. Стогнучы пад гэтым ярмом украінскі народ праз вусны сваіх прадстаўнікоў апэлюе да сусьветнай апініі...

„Голас гукаючага ў пустыні“. Ведама-ж, „сусьветная апінія“ яшчэ мацней зацісьнена ў кулак апошнім паразуменьнем Чэмбэрленаў, Брыянаў, Штрээманаў, Мусоліні, Бэнэшаў і Скшыньскіх... Дык не папсуе ім на бліжэйшы час добрага апэтыту.

Але-ж, першае,—артыкул гэты толькі скарочаны перадрук з украіскіх газэтаў (глядзі „Діло“ № 234 і „Украінскі Голас“ № 44), дзе пратэст украінскіх паслоў, заяўлены женеўскай прэсай, быў пададзены самым урадавым П. А. Т.-ам і быў надрукаваны поўнасьцю ня гледзячы на істнуючую ў Аўстр. Галічыне папяр. цэнзуру. Але найбольш абураючым зьяўляецца тое, што гэты самы артыкул, скафіскаваны ў № 15 быў поўнасьцю, без найменшых перамен, надрукаваны ў папрэднім № 14 тэй жа газэты і ня быў сканфіскаваны... Калі аб гэтым было зьяўлена рэдактарам газэты прэсаваму рэфэрэнту пана Камісара, той сьпярша заявіў, што гэтага не магло быць. Але, параканаўшыся ў ідэнтычнасьці абодвух друкаў, сказаў, што гэта ўсе роўна: не дагледзілі тады, дык паправіліся цяпер...

Гэта ужо выразна граніčыць са зьдзекам...

Што гэтыя акты бяспрыкладнага надужыцьця ўлады не зьяуляюцца чымсь прыпадковым, але наадварот, добра уплянаванай сытэмай, тасаванай да беларускай прэсы, аб гэтым выразна сьведчаць вынікі толькі што адбыўшыхся 2 судовых працэсаў ў справе рэдактароў стала і упорна канфіскаваных і зачыняных беларускіх газэтаў ў Вільні.

На першым працэсе редактар быў апраўданы па ўсім абвінавачаньням за цэлы рад артыкулаў па 129 арт. КК, а засуджаны толькі за непашану ўлады.

Другі працэс—яшчэ паказальней: з 14 „крымінальных“ артыкулаў, паводле § 263 К. К. за 11 артыкулаў рэдактар быў апраўданы (каля 80%) і за 3—засуджаны на 1 месяц арышту, або 100 злотых кары грашыма.

Нават пасьля гэтак характэрнага судовага працэсу, месная адміністрацыя і надалей вядзе сваю тактыку беспадстаўнага перасьледаваньня беларускае прэсы і яе матэрыяльнага руйнаваньня.

Падаючы ўсе гэтае да ведама п. Міністра Унутраных Спраў пытаем:

1) Ці маніцца п. Міністар пацягнуць да адказнасьці п. Камісара Ураду на м. Вільно за сыстэматычнае надужываньне ўлады, праяўляючаяся ў пастаянным канфіскаваньні ім беларускіх газэт і то нават за зьмяшчэньне афіцыяльных інфармацыяў П. А. Т. і таксама за друкаваньне скаргаў да найвышэйшых уладаў на гэтую яго самаволю?

2) Ці і што маніцца зрабіць, каб Камісар Ураду ў м. Вільні перастаў у канцы канцоў вясьці дзікую практыку перасьледаваньня ў адносінах да апазыцыйнае беларускае прэсы?

Варшава дня 19 лістапада 1925 г.

[illegible]: Пасольскі Клюб Беларускай Сялянска-Работніцкай Грама[illegible]
Druk. Spółdz. Wytw., Wilno, Gdańska 3.